5. *Litak, S.* Atlas kościoła łacińskiego w Rzeczypospolitej Obojga Narodow w XVIII wieku. – Lublin, Towarzystwo naukowe katolicriego uniwersyteto Lubelskiego Iana Pawła II, 2006. – 511 s.

6. *Leodegarius, P.* Brevis conspectus historico-statisticus ordinis Shcolarum Piarum / P. Leodegarius (пераклад Я. Глінскага). – Romae, Apud curiam generalitiam PP. Scolopi di S. Pantaleo, 1932. – 318 с.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1767. – Воп. 1. – Спр. 14. – ЛЛ. 226–227.

8. Нацыянальны гістарычны архіў  Беларусі ў г. Гродна. – Ф. 2. – Воп. 20. – Спр. 2186. – ЛЛ. 1–2.

*І. Б. Лапцёнак*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
Мінск, Беларусь

*I. Laptsionak*
Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Belarus

**УДК 378.147.091.33**

# МІЖНАРОДНАЯ ЛЕТНЯЯ ШКОЛА ЯК ЭФЕКТЫЎНАЯ МАДЭЛЬ РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНЫХ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

# INTERNATIONAL SUMMER SCHOOL AS AN EFFECTIVE MODEL OF MODERN PROFESSIONAL COMPETENCIES OF SPECIALISTS

*У артыкуле даследуецца паняцце «міжнародная летняя школа», разглядаецца яго спецыфіка на прыкладзе дзейнасці ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь. На аснове праекта «Нясвіжская акадэмія» аналізуецца роля міжнароднай летняй школы ў развіцці прафесійных кампетэнцый спецыялістаў, практыка-арыентаваных методык навучання.*

*Ключавыя словы: міжнародная летняя школа, прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста, практыка-арыентаваны падыход, гісторыка-культурная спадчына.*

*The article explores the concept of «international summer school», its specificity is considered on the example of the activity of education institutions of the Republic of Belarus. On the basis of the Nesvizh Academy project, the role of the international summer school in developing the professional competencies of specialists, practice-oriented learning techniques is analyzed.*

*Key words: international summer school, professional competence of a specialist, practice-oriented approach, historical and cultural heritage.*

Развіццё сістэмы адукацыі абумоўлена стварэннем канкурэнтаздольнай нацыянальнай эканомікі і неабходнасцю падрыхтоўкі кадраў для яе

эфектыўнага функцыянавання. Сёння адбываецца станаўленне новага тыпу прафесіяналізму, які заснаваны не толькі на спецыяльных ведах, колькі на шырокіх кампетэнцыях. Стратэгічна важным прыярытэтам становіцца фарміраванне ў спецыялістаў навыкаў міждысцыплінарнага і трансдысцыплінарнага мыслення, гатоўнасці да пастаяннага прафесійнага ўдасканалення.

На сучасным этапе ў сістэме адукацыі рэалізуюцца новыя арганізацыйныя структуры, формы навучання, такія, як модульнае засваенне адукацыйных праграм, сеткавыя і праектна-групавыя формы работы, вучэбна-навукова-інавацыйныя кластары, эксперыментальныя пляцоўкі, філіялы кафедр на базах практыкі, якія садзейнічаюць прывядзенню прафесійнага ўзроўню спецыяліста ў адпаведнасць з сучаснымі патрабаваннямі сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства. Значныя перспектывы ў вырашэнні праблемы развіцця сучасных прафесійных кампетэнцый спецыялістаў вырашае, на наш погляд, такая форма работы ўстановы адукацыі, як міжнародная летняя школа.

За мяжой вопыт работы летніх школ шырока прымяняецца ў практыцы работы ўстаноў і грамадскіх арганізацый. Асаблівую цікавасць выклікаюць міжнародныя летнія школы, дзейнасць якіх звязана з працэсам інтэрнацыяналізацыі адукацыі, заснаванай на крос-камунікацыі і абмене. У працэсе навучання ўдзельнікі з розных краін свету маюць магчымасць атрымання замежнага досведу ў пэўных галінах ведаў і прафесійнай дзейнасці, а таксама наладжвання кантактаў для далейшага супрацоўніцтва. Сярод прыкладаў замежных летніх школ: Міжнародная летняя школа па адукацыі і развіццю (Кітай), Міжнародная летняя медыцынская школа (Егіпет), Летняя школа ў галіне гуманітарных навук (Японія), Летняя школа для журналістаў (ЗША), Летняя школа сучаснай эканамічнай геаграфіі (Італія), Летняя школа па менеджменту ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны (Грэцыя), Летняя школа лідарства і міжнароднага супрацоўніцтва (ЗША), Міжнародная летняя школа менеджменту (Германія), Еўраатлантычная летняя акадэмія (Польшча), Моладзевая летняя школа Арганізацыі аб'яднаных нацый па дыпламатыі (Румынія) і інш.

У Беларусі распаўсюджаны міжнародныя летнія школы, арганізаваныя ў асноўным установамі вышэйшай адукацыі. Сярод іх найбольшую папулярнасць атрымалі Міжнародная летняя школа беларусістыкі (Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы), Расійска-беларуская летняя школа «Гуманітарыстыка» (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, сумесна з Дзяржаўным акадэмічным універсітэтам гуманітарных навук), Міжнародная летняя школа рускай мовы (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі), Міжнародная летняя школа «Нясвіжская акадэмія» (Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сумесна з Інстытутам нацыянальный спадчыны ў Варшаве), Міжнародная

летняя школа «Пазнай Беларусь: ад адукацыі да культуры» (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка), Міжнародная летняя школа «Пояс сяброўства» (Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверстэт), Міжнародная летняя школа антрапалогіі (Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт), Міжнародная летняя школа «Трансфармацыя і інтэграцыя – Беларусь на шляху ў будучыню» (Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, пры падтрымцы Германскай службы акадэмічных абменаў DAAD) і інш.

На іх фоне вылучаецца сваёй спецыфікай адна са старэйшых міжнародных летніх школ у Беларусі, якая атрымала вядомасць і па-за межамі краіны, – Міжнародная летняя школа «Нясвіжская акадэмія»: яна дзейнічае на працягу больш дваццаці гадоў на аснове ратыфікаванага Міжурадавага пагаднення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Нясвіжская акадэмія стваралася напачатку 1990-х гг. – у перыяд, калі ў Беларусі толькі пачала фарміравацца рэстаўрацыйная і кансервацыйная школа, а ў Польшчы практыка рэстаўрацыі і кансервацыі ўжо мела значны вопыт, асабліва ў галіне аховы гістарычных ландшафтаў, сфарміраваны на прыкладзе як асобных аб’ектаў, так і комплексаў помнікаў і тэрыторый.

Асноўная мэта Нясвіжскай акадэміі – удасканаленне прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў з Беларусі, Літвы, Украіны, Малдовы, Расіі і Польшчы ў галіне ландшафтна-паркавай архітэктуры, аховы і рэстаўрацыі паркаў, сядзіб, помнікаў сакральнай архітэктуры і інш. У межах двухгадовага курса навучанне ў школе праходзяць спецыялісты ўпраўленняў (аддзелаў) культуры абласных і раённых выканаўчых камітэтаў, якія адказваюць за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны ў рэгіёнах; музейныя спецыялісты, якія займаюцца кансервацыяй, рэстаўрацыяй, захаваннем калекцый і музейных аб’ектаў; архітэктары; рэстаўратары; спецыялісты па ахове прыроднага ландшафту і інш. Першы этап навучання абазначаны як тэарэтыка-практычны і праводзіцца на тэрыторыі Беларусі, другі этап арганізаваны як стажыроўка на тэрыторыі Польшчы [1, с. 112]. Па выніках удзелу ў праекце слухачы, якія паспяхова абараняюць праект, атрымліваюць міжнародны сертыфікат.

Дзейнасць школы накіравана на пашырэнне прафесійных і дзелавых сувязей, прадастаўляе магчымасці прэзентацыі і прасоўвання інавацыйных праектаў у сферы культуры, стымулюе ўкараненне ў практыку новых ідэй і тэхналогій. Нясвіжская акадэмія адбываецца ў фармаце інтэнсіўнага навучання пад кіраўніцтвам вучоных і спецыялістаў-практыкаў, якія маюць вопыт аналізу і мадэлявання гісторыка-культурнага і прыроднага ландшафту, распрацоўкі і вядзення праектаў рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей на нацыянальным і міжнародным узроўнях. Навучанне праходзіць у форме лекцый, практычных заняткаў, семінараў, круглых сталоў, майстар-класаў, работы над навуковымі праектамі.

Праграмы школы вылучаюцца сваім міждысцыплінарным характарам, аб’ядноўваюць больш за 10 напрамкаў, сярод якіх архітэктура,

мастацтвазнаўства, культуралогія, музеялогія, рэстаўрацыя, кансервацыя, расліназнаўства, дэндралогія, ахова гісторыка-культурнай спадчыны, турызм і інш. За перыяд дзейнасці школы рэалізаваны праекты: «Аўтэнтычнасць як вартасць аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны», «Інтэгральнасць і комплекснасць як каштоўнасць аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны», «Ахова культурнага ландшафту», «Фарміраванне культурнага ландшафту», «Даследаванне палацава-паркавых ансамбляў і сядзіб», «Ахова і кансервацыя гістарычных могільнікаў», «Ахова, рэстаўрацыя і правілы выкарыстання помнікаў сакральнай архітэктуры», «Захаванне і рэстаўрацыя фартыфікацыйных і замкавых збудаванняў», «Выкарыстанне гістарычных аб'ектаў у турыстычных мэтах» і інш. Некаторыя праекты рэалізаваны на абласных базах на аснове вывучэння і экспертнай ацэнкі аб'ектаў пэўнага рэгіёна.

Адметнасцю праграм Нясвіжскай акадэміі з'яўляецца іх інтэгральны характар. Напрыклад, у тэматыку 23-га курса, распачатага ў 2017 г., увайшло вывучэнне сакральнага ландшафту, які аб'ядноўвае ў сабе каштоўнасць прыроднага ландшафту, архітэктуры і рэгіянальнай этнаспецыфікі і ўяўляе сабой своеасаблівы «sacrum» культуры. Акрамя навуковых кіраўнікоў рэстаўрацыйных работ, у іх прымаюць удзел эксперты Нацыянальнага інстытута спадчыны Польшчы, Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Белрэстаўрацыі, праектнага бюро Беларускага камітэта «ICOMOS», архітэктурна-мастацкага савета Беларускага Экзархата, Беларуска-польскай камісіі па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Сталымі базамі практыкі за час работы Нясвіжскай акадэміі сталі такія аб'екты, як Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», Замкавы комплекс «Мір», Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс, Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Ружанскі палацавы комплекс Сапегаў, Палацава-паркавы комплекс Пуслоўскіх у Косава, Музей-сядзіба Тадэвуша Касцюшкі, Храм-помнік у гонар Усіх святых у Мінску – на тэрыторыі Беларусі; Каралеўскі замак у Варшаве, Палац-рэзідэнцыя караля Яна III Сабескага ў Вілянова, Каралеўскі замак на Вавелі, Замак у Чорштыне, Замак у Нетзіцы, Музей «Лазенкі каралеўскія» – на тэрыторыі Польшчы [2, с. 58–60].

Работа Нясвіжскай акадэміі высока ацэньваецца краінамі-ўдзельніцамі праекта. З 1995 г. завершаны 22 курсы. Паспяхова прайшлі навучанне больш за 300 слухачоў з розных краін свету. Выпускныя работы шасці слухачоў з Беларусі былі прадстаўлены на Міжнародны конкурс імя Я.Захватовіча ў Польшчы і атрымалі першыя прэміі. Большасць

выпускных праектаў рэалізаваны ў межах краіны-ўдзельніцы праекта і ў практычнай дзейнасці ўстаноў, якія накіроўвалі слухачоў на навучанне ў Нясвіжскай акадэміі.

Вопыт работы Нясвіжскай акадэміі паказвае эфектыўнасць яе методык. Ён сведчыць аб тым, што сучасны змест праграмы, якая асвойваецца навучэнцамі, спецыялістамі пэўнай галіны, можа прадугледжваць не толькі засваенне прадметных ведаў, але і развіццё кампетэнцый стратэгічнага характару, асабліва важных у сучасных сацыяльна-эканамічных умовах. Практыка-арыентаваны падыход да арганізацыі практычных заняткаў, лабараторый, майстар-класаў накіраваны найперш на магчымасць падрыхтоўкі спецыялістаў не толькі кампетэнтных у справе аховы спадчыны, але і здольных стварыць гнуткую стратэгію адаптацыі культурнай спадчыны ў рэгіёнах і захавання нацыянальных традыцый. Камунікатыўныя складнікі, якія пашырае такая форма работы, як летняя школа, дапамагаюць сутнасна павысіць эфектыўнасць навучання. Сучасныя метады навучання пры гэтым з’яўляюцца актыўнымі метадамі фарміравання кампетэнцый, заснаванымі на ўключэнне ў практыку і дыялог з экспертнай супольнасцю.

Адметнай канфігурацыяй адрозніваецца і структура прафесійнай кампетэнтнасці спецыялістаў, якая фарміруе мадэль міжнароднай летняй школы. Асаблівую ролю ў ёй набываюць такія кампаненты, як прафесійна-дзейнасны (прафесійныя веды і ўменні, апрабіраваныя ў дзеянні і засвоеныя навучэнцам як найбольш актуальныя і стратэгічна значныя) і прафесійна-асабовы (прафесійна-асабовыя якасці, якія вызначаюць пазіцыю навучэнца як асобы і садзейнічаюць варыятыўнасці, аптымальнасці і эфектыўнасці яго прафесійнай дзейнасці).

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. 2016. Год культуры ў Беларусі = 2016. Год культуры в Беларуси = 2016. Year of culture in Belarus: навукова-папулярнае выданне / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь; укл. І. В. Немава. – Мінск: Беларусь, 2017. – С. 112–113.

2. Raport roczny Narodowego Instytutu Dziedzictwa. 2015. – Warszawa, Narodowy Instytut Dziedzictwa, 2016. – С. 58–60.